НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь, твой народ дачакаецца Залацістага, яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

№ 6 (118), КРАСАВІК 2011 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

## МЕРКАВАННЕ РЭДАКТАРА

# НА ЧУЖЫ РАТОК НЕ НАКІНЕШ ПЛАТОК

Бяда, як заўсёды, прыходзіць нечакана. Ніхто нават падумаць не мог, што ў спакойнай Беларусі, дзе жыве самы талерантны народ у Еўропе, можа здарыцца падобная трагедыя. Выбух у менскім метрапалітэне скалануў усю беларускую і сусветную супольнасць. Па ўсёй краіне папаўзлі злавесныя чуткі аб тым, каму гэта выгадна. Аднак выбух 11 красавіка – гэта не толькі 13 загінуўшых і каля дзвюх сотнь параненых. Гэта быў апошні ўдар па іміджу цяперашняй улады, якая здолела стварыць міф аб славутай "стабільнасці". Нягледзячы на заклікі кіраўніцтва краіны пра згуртаванне нацыі, гэта подлае і цынічнае злачынства ніяк не садзейнічала пазытыўным зменам у нашым грамадстве. І сапраўды, калі нам аб'ядноўвацца, дык вакол каго? Можа вакол тых, хто ўжо семнаццаты год робіць усё магчымае і немагчымае, каб канчаткова пахаваць на Беларусі свабоду слова? Відавочна, што пасля трагедыі ў метро палітычны раскол у грамадстве яшчэ больш паглыбіўся. Нават махровыя лукашысты ў прыватных гутарках пачыху сталі выказваць нядавер да афіцыйнай версіі злачынства, агучанай уладамі. Дарэчы, падобная версія заўсёды ліпне да рэжымаў, якія пануюць у несвабодных краінах. Калі ўсё жыццё грамадзян зацiснута пад кантролем арміі спецслужбаў, дзе "мыш не праскочыць", тады хто, калі не улада? Тым больш, што Лукашэнка не выключае датычнасці да тэракта "каго- небудзь з улады." "Мы з вамі, у тым ліку і я, стварылі тую атмасферу, плады якой мы сёння пажынаем. Гэта – галоўная прычына, – сказаў кіраўнік краіны. – У гісторыі так было заўсёды, сітуацыю выкарыстоўвалі нашы ворагі". Зразумела, гэта рэфлекторная рэакцыя рэжыму, які бачыць пагрозу сабе ў тых канкурэнтах, якія пасягаюць на змену ўзурпатараў, і адпаведна рэагуе. Але не толькі дэмакратычныя сілы палохаюць уладу трымаючых. Паля выбуху 11 красавіка наведванне незалежных інтэрнэт-сайтаў зашкальвала. Прычым у тых блогах, дзе людзей, акрамя бытавухі нічога не хвалявала, пачалі актыўна цікавіцца палітыкай. І нават хуткае раскрыццё злачынства не супакоіла грамадства, а наўпрост выклікала новую хвалю скепсісу і недаверу. Здавалася б, расклад палітычных сімпатыяў беларусаў радыкальна не змяніўся. Тая частка насельніцтва, якая не даверала ўладзе раней, – у яе недавер будзе ўмацоўвацца. Тыя ж, хто слепа давераў уладзе ва ўсім– наўрад ці сталі відушчымі. Тым не менш, распачалася чарговае паляванне на незадаволеных. Надоечы першымі ў гістэрыку кінуліся афіцыйныя СМІ. Столькі бруднай лаянкі на апазіцыю за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі яшчэ не было чуваць. Пры гэтым упершыню бруд ліўся і на тых, хто толькі ананімна ў інтэрнэце асмеліўся намякнуць на тэму "вінавата ўлада". Часам стваралася ўражанне, што ў краіне ўсталявалася царства хама. Бацькавы прапагандысты слоў не выбіралі. "Пятая калона, ідыёты, здраднікі, адмарозкі, падонкі, уроды…" Адначасова чыноўнікі і розныя "дзеячы" прызнаваліся ў вернападданасці дзейнаму кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку. Тым самым як бы наводзілі народ на думку, што маўляў, акрамя Аляксандра Рыгоравіча абараніць ад тэрарыстаў больш някаму. Літаральна на наступны дзень пасля трагедыі выказваца аб версіях тэракта ў метро наогул стала небяспечна. З пагрозаў генеральнага пракурора РБ Рыгора Васілевіча пачалася барацьба з чуткамі і плёткамі. Паводле Васілевіча, былі выяўлены пляткары, якія паднялі паніку ў інтэрнэце пра новыя выбухі. Канешне, генпракурор мае рацыю, калі звяртае ўвагу на дробных правапарушальнікаў. Аднак перасяд тых абалтусаў, якія адрываюць ад работы міліцыю і раздражняюць абывацеля, гэта не яго справа – для гэтага ёсць адпаведныя службы і яны добра спраўляюцца. Даўно заўважана, што любы перапалох ці банальны ажыятаж сярод насельніцтва ( з той жа валютай і цукрам) непазбежна становяцца падставай для наступу на свабоду слова. Адразу пачаўся ціск і на незалежную прэсу – у сувязі з асвятленнем тэракту "наша Ніва" і "Народная Воля" ўжо атрымалі афіцыйныя папярэджанні і апынуліся на мяжы закрыцця. Больш таго, рэпрэсіі супраць незалежных медыяў узмацніліся і пасля таго, як уладамі было абвешчана, што выбух учынілі нейкія "віцебскія маньякі". Як стала вядома, была затрымана рэдактарка газеты "Віцебскі кур'ер" Вольга Карач і праваабаронца Павел Левінаў. И зноў усё тая ж сумна вядомая ( неўяздная) суддзя Фрунзенскага раёна Менску Вольга Камар прызнала іх вінаватымі ў дробным хуліганстве нібыта за лаянку. Карач аштрафавалі, а Левінаў атрымаў дзесяць сутак арышту. Варта нагадаць, што газета "Віцебскі кур'ер" апошнім часам выходзіла нерэгулярна, ды і крытычных матэрыялаў пра недахопы з боку улады на яе старонках змешчана не было. Тады чаму і яны пад раздачу трапілі? Не сакрэт, што ўлады даўно дазвалялі сабе сілавое ўмяшальніцтва ў работу СМІ , а цяпер плануюць усталяваць татальны кантроль над незалежнай журналістыкай. А калі незалежны журналіст інфармуе насельніцтва, але не абслугоўвае асабістыя інтарэсы арміі бюракратаў, тады яго вінаваціць у чым заўгодна. Аднак тым прапагандыстам з БТ і друкаваных выданняў, якія працуюць на прэзідэнцкую вертыкаль, не варта забываць прыказку: "Як гукнеш, гэтак і адгукнецца". Рана ці позна іх сам рэжым выкіне з наменклатуры, як непатрэбную рэч. Адразу пасля "выбараў" збег самы адыёзны бацькавы паслугач, кіраўнік Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі. Цяпер яго інтарэсы звязаны з Расеяй. Так пацукі, адчуўшы першымі ваду, спешна пакідаюць карабель. А для струхлелага карабля любая хваля плётак небяспечна – ён перакуліцца разам з яго нягеглай камандай і звар'яцелым капітанам.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ

# Жыць годна і прыстойна

Выйшла з друку новая кніга шумілінскага літаратара, краязнаўцы Антона Параскевіна (В. В. Улюценка) "Августовская купель". Кожная новая кніга гэтага аўтара выклікае нязменную цікаўнасць чытачоў нашага раёна. Як заўжды цікава і ў сваёй адметнай манеры прытчаў і жыццёвых сказаў Віктар Васільевіч распавёў аб героях сваёй новай кнігі. На першы погляд – гэта звычайныя вясковыя жыхары, аднак яны не пазбаўлены хрысціянскай дабрадзейнасці і любові да Бацькаўшчыны. Як актыўны даследчык шумілінскага краю і мясцовай гісторыі, Віктар Улюценка добра раскрыў своеасаблівыя рысы характару нашых землякоў. Героі кнігі – сяляне з Жарабыччыны, простыя людзі, якія нягледзячы на жыццёвыя хібы, працягваюць слаўныя традыцыі сваіх продкаў. Без сумневу, сам аўтар застаўся верным дарагім сэрцу мясцінам, абагаціў чытача расповедамі аб мінулым жыцці рэгіёна. У сборнік таксама ўвайшлі раннія вершы пісьменніка, яго паэма "Сказ о Давиде", дзе чытач пазнаёміцца з новымі паэтычнымі знаходкамі. Будзем спадзявацца, што новая кніга вядомага краязнаўцы паслужыць штуршком, сродкам папулярызацыі гісторыі Шумілінщчыны.

**Алесь Прыбярэжны.**

## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

## ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ

# ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА НЯДБАЙНЫХ БАЦЬКОЎ НЕ ВЫПРАЎЛЯЕ

Да псеўдабацькоў, як называе іх цяперашняя ўлада, у нашым раёне адносіці адназначна. Калі яны не спраўляюцца са сваімі абавязкамі, п'юць, не працуюць, стварылі ў сям'і рэальную пагрозу жыццю дзяцей, значыць, будуць прыняты меры, каб стварыць дзецям належныя ўмовы і ўзмацніць адказнасць дарослых. Аднак у рэальным жыцці ўзмацненне карных мераў да гэтак званых нядбайных бацькоў жаданага выніку не даюць. Безумоўна, у кожным выпадку ёсць розныя абставіны, з-за якіх людзям не ўдаецца карэнным чынам вярнуць сабе высокі статус маці або бацькі. І гэта – не адзінкавыя прыклады. Пасля таго, як з'явіўся Дэкрэт № 18 "Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у нядобранадзейных сем'ях" у нашым раёне з'явілася кагорта бацькоў з ганебным статусам "абавязаныя". У эту катэгорыю трапілі тыя гора-бацькі, якія запазычылі дзяржаве за ўтрыманне іхніх дзяцей у прытулку. Зараз на ўліку ў нашым раёне 125 чалавек. Паводле 18-га дэкрэту, для іх на прадпрыемствах спецыяльна створана "бронь", і яны павінны адпрацоўваць там свае даўгі па рашэнню суда. Ёсць дзве катэгорыі нядобранадзейных сем'яў. Адна, калі людзям крыху дапамажаш і сітуацыя выпраўляецца да лепшага. Але ёсць і другая, якіх большасць: колькі ім не дапамагай – усё безвынікова. Наадварот, яны паводзяць сябе так, нібыта ў іх цяжар з плеч зваліўся. Тады іх існаванне каціцца па інерцыі, маўляў, пазбавілі бацькоўскіх правоў і тым самым знялі з іх плячэй клопат аб родных дзецях. Пі, гуляй сабе, шчодрая дзяржава тваіх дзетак у людзі выведзе. Такім чынам і паводзіла сябе адна грамадзянка з вёскі Язвіна. Жаданне працаваць не ўзнікла, а з-за цягі да спіртнога зусім забылася, што ў ёй ёсць дзіця. Перадусім жанчыну пазбавілі бацькоўскіх правоў, далі шанс на выпраўленне, дапамаглі ўладкавацца на працу ў мясцовы калгас "Баравінка". Аднак першы судовы працэс наглядным урокам для маці-зязюлі не паслужыў. Яе параненейшаму не турбавала тое, што цяпер патрэбна аддаваць доўг дзяржаве за выхаванне дзіцяці, якое знаходзілася ў Обальскім прытулку. Лячыцца ад алкагалізму жанчына не захацела, п'янкі і гулянкі працягваліся. За ўхіленне ад вяртання дзржаве даўгоў супраць яе была ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле 174. Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Па рашэнню выязнога суда Шумілінскага раёна 33 гадовую кабету накіравалі на прымусовае лячэнне ад алкагалізму і грамадскія работы на 240 гадзін. А калі гэта мера не дапаможа, то наступнае пакаранне – да двух гадоў пазбаўлення волі. Аналіз сітуацыі паказвае, што прымусовая праца абавязаных асобаў пакуль што з'яўляецца слабым звяном у выхаванні нядбайных бацькоў. У асноўным, гэта, канешне людзі, якія вядуць працяглы час асацыяльны лад жыцця, па сутнасці – працягваюць злоўжываць алкаголем. Часта бывае, што прыходзяць на работу ў нецвярозым стане. А хто даверыць чалавеку на падпітку добрае абсталяванне? Таму гэта хутчэй за ўсё будзе нізкааплатная работа, чалавек не зможа сам сябе пракарміць, не кажучы пра тое, каб выплачваць грошы на дзяцей. Нават калі алкаголіка "закадзіраваць", то гэта ўсё роўна хворы чалавек. І каму ён патрэбен, калі зараз маладым і здаровым у раёне не хапае працоўных месцаў?

**Я. Вайтовіч.**

# АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвес-ткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатныхюрыстаў.Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# Неафіцыйныя сметнікі

Нягледзячы на ўсе высілкі ўладаў па навядзенню парадку на зямлі, тэрыторыя раёна працягвае захламляцца бытавым смеццем. І хаця ў гэтым накірунку выкананы значны аб'ём работ, падставаў для заспакаення няма. Ёсць яшчэ нямала ўчасткаў на зямлі, дзе ляжаць цэлыя горы бытавых і прамысловых адыходаў – у пералесках, паблізу дарог, каля могілак. Асабліва гэты праблема тычыцца сельскіх населеных пунктаў. Мерапрыемствы падчас гэтак званых месячнікаў да пасёлкаў і вёсак, здаецца, не даходзяць. У большасці з іх зафіксаваны несанкцыянаваныя звалкі. Палімерныя бутэлькі, гной, будаўнічае смецце, раскіданы ў беспарадку металам і многае іншае, што не ўпрыгожвае наша жыццё. У той жа час настала пара ўзмацніць адказанасць за ўтварэнне месцаў несанкцыяніраваных смеццязвалак. Як заявіў на пасяджэнні штаба па добраўпарадкаванні кіраўнік раёна В. А Падляшчук, "павінны быць чысціня і парадак у сваім доме, які называецца Шумілінскі раён". І займацца добраўпарадкаваннем, на яго думку, павінен актыў раёна: кіраўнікі і спецыялісты працоўных калектываў. А тым адказным асобам, хто не здолее арганізаваць вывазку адыходаў на палігон, пракурор раёна раёна Я. Гуляеў нагадаў Кодэкс РБ аб адміністрацыйных парушэннях. У выпадку невыканання патрабаванняў па навядзенні парадку на юрыдычную асобу можа быць накладзены штраф ад 20 да 100 базавых велічынь. Таму кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, сельскіх выканаўчых камітэтаў абавязаны прыняць неабходныя меры па навядзенню належнага парадку на сваіх падведамасных тэрыторыях. У сваю чаргу сваё важкае слова павінны сказаць раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольных асяроддзя, цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, іншыя раённыя службы. Яны абавязаны не толькі выяўляць месцы несанкцыяніраваных смеццязвалак, але накіроўваць усе сілы на тое, каб арганізатараў гэтых звалак вывесці, так бы мовіць, на чыстую ваду. Аднак, як вынікае з афіцыйных інфармацыйных крыніц, у гэтым годзе шырокая грамадскасць не ведае, на чым сумленні гэтыя брудныя ў прамым і пераносным сэнсе ўчынкі. Да прыкладу, жыхары аграгарадка Амбросавічы паведамілі нашай газеце, што каля аддаленай вёскі Чарнецкае ўжо каторы год вывозяць смецце ў бліжэйшы лес. Праблема, як кажуць з барадой. Карэспандэнт "Світанка" падрабязна вывучыў сітуацыю на месцы і знайшоў у хмызняку самавольны сметнік. Фотакамера зафіксавала цэлы міні-палігон бытавых адыходаў. Як аказалася, у вызначаныя дні калгасны трактар збірае смецце ад жылых дамоў, а затым яго вывозіць у лес. Па ўсяму бачна, што ліквідаваць несанкцыяніраванную звалку ніхто не збіраецца. Хто адказвае за гэты тэрыторыю – невядома. Праўда, пасля званка ў райвыканкам пытанне ўзялі на кантроль і абяцалі выправіць недахопы. Зразумела, што не адным днём збіраліся гэтыя звалкі, якія цяпер – нібыта помнікі людской безгаспадарчасці і абыякавасці да роднай зямлі. На жаль, нашы людзі не заўсёды прытрымліваюцца самасвядомасці. Хто з нас, паклаўшы руку на сэрца, прызнаецца, колькі разоў шпурнуў у куст пустую бутэльку, пачак з-пад цыгарэтаў ці недакурак? А які дачнік не выкідваў у бліжэйшы лясок смецце? Ёсць над чым падумаць.



**На фота:** адзін з неафіцыйных сметнікаў.

**С. Горкі.**

РЫНАК ПРАЦЫ

# ЯКІЯ У РАЁНЕ ВАКАНСІІ?

Працаўладкаванне жыхароў нашага раёна – пытанне, якое ніколі не страціць сваёй актуальнасці. Якія прафесіі запатрабаваны на рынку працы? Ці прымаюць наймальнікі належныя меры для таго, каб знізіць сацыяльную напружанасць? На рынку працы Шумілінскага раёна працяглы час не запаўняюцца ў асноўным вакансіі спецыялістаў у галіне аграпрамысловага комплексу. Трэба заўважыць, што каледжы і ВНУ штогод размяркоўваюць у кожнае сельгаспрадпрыемства дастатковую колькасць маладых спецыялістаў. Разам з тым адчуваецца востры недахоп наступных спецыялістаў: аграномаў, заатэхнікаў, эканамістаў, ветурачоў, бухгалтараў, інжынераў. Грамадзяне, якія шукаюць працу, могуць звярнуцца ў сектар занятасці ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне райвыканкама. Тут маюцца звесткі, дзе будзе прадастаўлена работа і жыллё, а тксама можна даведацца аб памерах грашовай дапамогі і акладах. Штомесяц гэтыя звесткі абнаўляюцца. На першае красавіка 2011 года на пастаянную работу патрабуюцца ў ААТ Ляжні: галоўны заатэхнік, галоўны энергетык, токар, ветэрынарны фельчар, інжынер па ахове працы. Прадстаўляецца жыллё: дамы прысядзібнага тыпу. Аклады ад 750 да 850 тысяч рублёў. У ААТ "Прыазёрны мір" запрашаюць на работу двух бухгалтараў, эканаміста, агранома, юрыста, галоўнага заатэхніка (аклад 915 тысяч рублёў), галоўнага ветэрынарнага ўрача ( аклад 915 тысяч рублёў) і двух брыгадзіраў па раслінаводству. Усім даюць кватэры або дамы прысядзібнага тыпу. У КУСГП "Ульскі" патрабуюцца два ветэрынарныя ўрачы, бухгалтар, намеснікі дырэктара па ідэалогіі і па вытворчасці. У ААТ "Прыдзвінскі" чакаюць галоўнага ветурача, галоўнага заатэхніка (аклады па 800 тыс рублёў), бухгалтара, бухгалтара па заработнай плаце, агранома, інспектара па кадрам. Сялянска-фермерская гаспадарка "Крыніца" мае свабодныя вакансіі галоўнага заатэхніка і галоўнага ветурача (аклады па 522 тысячы рублёў). У "Шумілінскім райаграсервісе няма галоўнага агранома, у КУСГП "Мішневічы" патрабуюцца аж пяцёра заатэхнікаў, у тым ліку і галоўны з акладам у 804 тысячы рублёў. Для жадаючых працаваць ў КУСГП ёсць вакансіі эканамістаў, інжынера па ахове працы, брыгадзіра па раслінаводству і заатэхніка. Увогуле, знайсці работу ў нашым раёне можна заўсёды. І напэўна, людзей з сіндромам хранічнага беспрацоўнага не так і многа. Тым больш, што пры ўладкаванні на работу адміністрацыя прадпрыемстваў прапануе яшчэ і грашовую дапамогу ( два-тры аклады). Пакуль што ёсць за што жыць, было б жаданне працаваць.

**Алесь Прыбярэжны.**

УЛАДА І ГРАМАДСКАСЦЬ

# У Віцебску «чарнобыльскую» акцыю забаранілі

**Віцебскія дэмакратычныя актывісты атрымалі адмову наконт правядзення акцыі да ўгодкаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС у Парку культуры і адпачынку чыгуначнікаў. Але яны ўсё адно мяркуюць сабрацца — на плошчы Свабоды.**

Віцебскія актывісты мелі намер правесьці мітынг салідарнасьці з пацярпелымі ад аварыі на АЭС у Японіі і згадаць ахвяраў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, распавёў адзін з арганізатараў, каардынатар руху «За свабоду» ў Віцебскай вобласьці Хрыстафор Жаляпаў:

«У адміністрацыі Чыгуначнага раёну нам адмовілі з прычыны таго, што мы не заключылі дамовы з ЖКГ, каб забясьпечыць парадак на месцы мітынгу — у Парку культуры і адпачынку чыгуначнікаў. Але з ранейшага досьведу нам вядома, што дамовы наконт аховы правапарадку, мэдычнага абслугоўваньня і паслуг ЖКГ адпаведныя структуры заключаюць толькі пасьля атрыманьня дазволу на правядзеньне мерапрыемства. Так што нас ізноў пусьцілі па „зачараваным коле", хоць разам з заяўкай мы дасылалі ў раённую адміністрацыю ліст, дзе тлумачылі: мы гатовыя заключаць усе неабходныя дамовы, але найперш з нас патрабуюць дазвол!».

Віцебскія актывісты ўжо зьвярталіся ў Віцебскі гарвыканкам, каб памяняць парадак атрыманьня дазволаў на акцыі: каб у раённых адміністрацыях не патрабавалі дамоваў, якія папярэдне заключыць немагчыма. Але з гарвыканкаму адказалі, што гэтае рашэньне перагляду не падлягае.

Тым ня менш прадстаўнікі грамадзкасьці гораду вырашылі, што 26 красавіка жалобная акцыя ўсе адно павінна адбыцца: усіх жыхароў Віцебску запрасілі сабрацца а 17:30 на плошчы Свабоды, каб разам прыняць зварот да ўрадаў Расеі і Беларусі пра недапушчальнасьць будаўніцтва новай, Астравецкай АЭС.

# КІРМАШ З КУСАЧЫМІ ЦЭНАМІ

У суботу, напярэдадні Вялікадня некаторае ажыўленне назіралася на плошчы шумілінскага рынку. Тут праходзіў веснавы кірмаш, дзе можна было набыць неабходныя прадукты харчавання, насенне гародніннных культур, кветак, саджанцы пладовых дрэў і кустоў. Аднак, як кажуць, няма таго, што раньш было. Калі ў былыя гады можна было купіць усё, што душа жадала, то цяпер асартымент тавараў быў большы, чым сціплы. А дзевятай гадзіне раніцы народ ужо тоўпіся каля гандлёвых радоў. Найперш карысталіся попытам вялікодныя кулічы, тарты, булкі, словам, розная выпечка. Іх падвозілі на рынак работнікі Шумілінскага райспажывытаварыства. У некаторых вёсках захавалася традыцыя хадзіць у Вялікдзень на могілкі. Таму быў разнастайны выбар штучных кветак. Нязменны атрыбут веснавых дачных і агародных работ – насенне. Выбар яго цяпер быў на розныя густы і розных вытворцаў, як айчынных, так і замежных. Што тычыцца насення другога хлеба, дык тыя людзі, якія спадзяваліся купіць элітную беларускую бульбу, хутка развіталіся з ілюзіямі. Вядома, што бульба ў мінулым годзе не ўрадзіла і набыць яе для новага ўраджаю сёлета складана. Замест беларускай усяго адзін прыватнік з машыны прадаваў гатунак галандскай селекцыі "фрэска". Ахвотнікаў амаль не знайшлося, пэўна пакупнікоў палохала цана 5000 тысяч рублёў за кілаграм насеннай бульбы. Сапраўдны удар па кішэні. А ў мясным павільёне, як заўсёды, гандлявалі мясам. Дзве гандляркі рэалізоўвалі свініну па 13-15 тысяч рублёў. Тут было не шматлюдна. Затое бойка ішоў гандаль там, дзе прадавалі саджанцы пладовых дрэў. Цэны былі прымальныя: саджанцы яблыні ішлі па 20 тысяч, чарэшня і вішня – 30 тысяч, чырвоныя і чорныя парэчкі – па 10 тысяч, агрэст – 20 тысяч. Найбольшым попытам у пакупнікоў карысталася насенне цыбулі. Але і на яе цэны кусаліся: за кілаграм "лука-сяўка" прасілі 20 тысяч рублёў.

**У. Амбросаў.**

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# БЕЗ ПАДТРЫМКІ ГРАМАДСТВА З БАГНЫ НЕ ВЫБРАЦЦА

Без дапамогі з боку мясцовых уладаў былыя асуджаныя не змогуць адаптавацца ў грамадстве. Кіраўніцтва Шумілінскага працягвае праводзіць мэтанакіраваную работу па папярэджанню рэцыдыўнай злачыннасці. Актуальнасць дадзенай задачы абумоўлена тым, што асобы, якія нядаўна прыбылі ў наша раён з месцаў пазбаўлення волі, не заўсёды могуць знайсці сваё месца ў грамадстве. Пэўная колькасць вярнуўшыхся з месцаў пазбаўлення волі знаходзіць у сабе сілы, каб стаць на шлях выпраўлення. У многім ім дапамагаюць родныя і блізкія. Але большасць нідзе не працуе і нават не прыкладае ніякіх намаганняў, каб уладкавацца на работу. Сутыкнуўшыся з непераадольнымі цяжкасцямі вольнага жыцця, некаторыя з іх аддаюць перавагу крымінальнаму шляху. Хаця выдзяляецца браня для іх працаўладкавання, пры пастаноўцы на ўлік па беспрацоўі – выплачваецца дапамога. Пры жаданні яны могуць атрымаць пэўную спецыяльнасць на курсах падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі. Зараз у Шумілінскім раёне ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі зарэгістравана 248 чалавек. Гэта грамадзяне, якія былі асуджаныя да выпраўленчых або грамадскіх работ, не звязаных з ізаляцыяй ад грамадства. Акрамя таго, у раёне пражывае больш за паўсотні чалавек, якія адбывалі тэрмін пазбаўлення волі. Нямала і такіх, якія маюць непагашаную судзімасць, за такімі асобамі па рашэнню суда ўстаноўлены прэвентыўны нагляд. Менавіта для гэтай катэгорыі грамадзян было праведзена комплекснае мерапрыемства "Нагляд". Супрацоўнікі міліцыі аб'ехалі месцы жыхарства больш за 200 чалавек, якія стаяць па ўліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі. У мэтах прафілактыкі мінулым летам ладзілі мерапрыемствы, накіраваныя на папярэджанні злачынстваў сярод судзімых асоб. Судзімыя асобы – гэта найбольш нестабільная ў сацыяльных адносінах катэгорыя правапарушальнікаў. Таму апроч сумесных рэйдаў, з імі праводзіцца выхаваўчая работа: акцыі пад назвай "Альтэрнатыва", "Правільны выбар – твая будучыня". Прынятыя меры аказаліся эфектыўнымі: з пачатку года раней судзімыя не ўчынілі ў раёне ніводнага злачынства. Прынамсі, удзельная вага рэцыдыўнай злачыннасці ўдвая ніжэй сярэднеабласнога паказчыка – усяго 15%. Толькі два чалавекі зноў захацелі на казённы хлеб: на іх завялі крымінальную справу па арт.416 КК Рэспублікі Беларусь. Аднак, як паказала практыка, пераважная большасць людзей з "месцаў не надта аддаленых" па-ранейшаму не жадаюць вяртацца да законапаслухмянага жыцця. Наўрад ці можна дапамагчы былым зняволеным аднымі інспекцыямі ды грамадскімі работамі. Галоўнае ўсё ж, каб у чалавека была праца, сродкі для жыцця, дах над галавой. Што рабіць чалавеку, які не мае родных, згубіў здароўе, наогул страціў сацыяльныя сувязі? У гэтым выпадку інспектары павінны працаваць супольна з выканаўчымі органамі ўлады, грамадскімі арганізацыямі, кіраўніцтвам прадпрыемстваў, цэрквамі. Каб былыя асуджаныя знаходзіліся ў полі зроку сацыялагічнай службы, патрэбны рэабілітацыйны цэнтр. А калі грошай ў раёне няма, то для пачатку неабходна распрабаваць больш сціплы праект па прыкладу другіх райцэнтраў. Дзе-нідзе ў нашай краіне адкрыты пункты сацыяльнай адаптацыі. Пад такі пункт можна выдзеліць некалькі пакояў у інтэрнатах для рабочых. Або знайсці сродкі і адрамантаваць стары пустуючы інтэрнат на вуліцы Дубасарскага, што ў мікрараёне гэтак званага брыкету. Ёсць і іншыя варыянты. Вось толькі хто будзе клапаціцца пра вартыя ўмовы пражывання былых "зэкаў"?

**Алесь Шумскі.**

ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# ЧЕМ ГРОЗИТ БЕЛОРУССКОЙ ЭКОНОМИКЕ УДЕРЖАНИЕ КУРСА РУБЛЯ?

НАЦБАНК НЕ ЗАХОТЕЛ УЗНАТЬ РЕАЛЬНЫЙ КУРС РУБЛЯ. ОБЪЯВЛЕННАЯ ДОПОЛНИТЕЛЬНАЯ СЕССИЯ НА ТОРГАХ БЕЛОРУССКОЙ ВАЛЮТНО-ФОНДОВОЙ БИРЖИ НЕ СОСТОЯЛАСЬ. ПОЧЕМУ ПРАВИТЕЛЬСТВО В ПОСЛЕДНИЙ МОМЕНТ ДАЛО ЗАДНИЙ ХОД, СКОЛЬКО ЕЩЕ ПРОДЕРЖИТСЯ НЫНЕШНИЙ КУРС РУБЛЯ И ПОЛУЧИТ ЛИ БЕЛАРУСЬ РОССИЙСКИЙ КРЕДИТ БЕЗ ПРОВЕДЕНИЯ ДЕВАЛЬВАЦИИ, ВЫЯСНЯЕТ «ЗАВТРА ТВОЕЙ СТРАНЫ».

**Рыночный курс ушел дальше, чем ожидали**

Надежды на альтернативную сессию, на которой бы определился рыночный курс, не оправдались. Нацбанк, сославшись на необходимость «значительной подготовительной работы технического характера», перенес открытие альтернативных торгов на неопределенное время. Рынок по-прежнему стоит.

Почему правительство в последний момент дало задний ход и как собирается выкручиваться из сложившейся ситуации?

— Честно говоря, непонятно, на что рассчитывает правительство, — отмечает финансовый аналитик **Сергей Чалый.** — Думаю, альтернативную сессию отменили по той причине, что испугались курса, который мог бы на ней сложиться. Ведь после того, как было заявлено о возможном открытии второй сессии, межбанк даже заработал. Сделки шли в районе 4800-5000 рублей за доллар. И буквально на следующий день банкам настоятельно порекомендовали не проводить сделки выше 4500 рублей за доллар.

Экономический обозреватель **Кирилл Коктыш** также считает, что решение Нацбанка не проводить альтернативную сессию может означать лишь то, что у белорусских властей нет уверенности в возможном урегулировании вопроса благоприятным для них образом.

— Власти понимают, что это принесет не желаемый для них результат, — считает эксперт. — Сегодня нет уверенности в крепости белорусской валюты. Проблема по большому счету осталась нерешенной.

Иными словами сегодня курс уже настолько далеко ушел от декларированного, что белорусскому руководству вряд ли удалось бы сохранить лицо, показав рыночную стоимость рубля. Вот почему, по мнению руководителя аналитического центра «Стратегия» **Леонида Заико,** воздержаться от торгов для власти было бы самым правильным.

— Деловая среда, внутренний и внешний бизнес, банки, которые работают с Беларусью и вне ее, уже подошли к определенной величине курса, которая используется в расчетах при поставках импортных товаров, — отмечает экономист. — Этот курс 1 доллар – 6 тысяч белорусских рублей. Начинать торговать на альтернативной сессии и выйти на курс пускай не 6, а 5 тысяч рублей означало бы практически неминуемую отставку правительства. Это был бы разлом рыночной и финансовой ситуации. Курс слишком далеко уходил бы от официально декларированного.

По мнению Леонида Заико, нынешняя пауза необходима, чтобы сформировать более-менее приличное предложение валюты.

— Предложение валюты сформировать можно только за счет того, что те или иные субъекты, имеющие доходы от экспорта, выйдут с большими пакетами. А сейчас все хотят придержать валюту. Пока нет российского кредита, ориентация идет на то, что все играют на повышение курса доллара, -- отмечает эксперт.

**Россия даст кредит, ей некуда деваться?**

